ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар
Нацыянальнага інстытута
адукацыі

________________ В.В. Гінчук
«13» чэрвеня 2019 г.

**ПАЛАЖЭННЕ**
**АБ МІЖНАРОДНЫМ КОНКУРСЕ ПРАЕКТАЎ**
**«БЕЛАРУСЬ І КІТАЙ: МОСТ У БУДУЧЫНЮ»**

## 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Дадзенае палажэнне рэгламентуе парадак арганізацыі і правядзення Міжнароднага конкурсу праектаў «Беларусь і Кітай: Мост у будучыню» (далей – Конкурс) сярод навучэнцаў Беларусі і Кітая ад 15 да 18 гадоў, а таксама вызначае мэты і задачы, патрабаванні да ўдзельнікаў, тэрміны правядзення і іншыя аспекты правядзення Конкурсу.

1.2. Інфармацыя аб правядзенні мерапрыемства размяшчаецца на старонках нацыянальнага адукацыйнага партала (https://adu.by), афіцыйных старонках нацыянальнага адукацыйнага партала ў сацыяльных сетках Facebook, «ВКонтакте» і інш.

## 2. МЭТЫ І ЗАДАЧЫ КОНКУРСУ

2.1. Конкурс скіраваны на развіццё цікавасці да бесперапыннай адукацыі, стымуляванне асобаснага і інтэлектуальнага развіцця праз выкарыстанне магчымасцяў сучасных інфармацыйных тэхналогій.

2.2. Асноўныя задачы Конкурсу:

- стварэнне асяродку для асобаснага і інтэлектуальнага развіцця навучэнцаў;
- стымуляванне цікавасці да навучальнай дзейнасці;
- спрыянне развіццю камп’ютарнай граматнасці ўдзельнікаў;
- садзейнічанне ў прафесійным самавызначэнні навучэнцаў;
- стварэнне асяродку для сяброўства і ўзаемадзеяння ўдзельнікаў.

## 3. АРГАНІЗАТАРЫ КОНКУРСУ

3.1. Арганізатарам Конкурсу з’яўляецца навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

3.2. Метадычную і тэхніка-тэхналагічную падтрымку Конкурсу забяспечвае ўпраўленне дыстанцыйных адукацыйных паслуг Адукацыйнага цэнтра навукова-метадычнай установы «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
3.3. Для арганізацыі і правядзення Конкурсу фарміруецца арганізацыйны камітэт (далей – Аргкамітэт).
3.4. Аргкамітэт выконвае наступныя функцыі:

- прымае заяўкі на ўдзел у Конкурсе;
- фарміруе склад журы;
- ажыццяўляе інфармацыйную падтрымку мерапрыемства;
- вызначае час, месца правядзення цырымоніі ўзнагароджання;
- іншыя арганізацыйныя пытанні, звязаныя з правядзеннем Конкурсу.

## 4. ЖУРЫ КОНКУРСУ

4.1. Журы Конкурсу фарміруецца Аргкамітэтам са спецыялістаў навукова-метадычнай установы «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
4.2. Журы Конкурсу ажыццяўляе наступныя функцыі:

- кантралюе падвядзенне вынікаў Конкурсу;
- разглядае звароты ўдзельнікаў Конкурсу;
- вызначае пераможцаў і ўносіць прапановы па ўзнагароджанні.

4.3. Рашэнне журы Конкурсу прымаецца на пасяджэннях і афармляецца пратаколам. Рашэнне лічыцца прынятым, калі за яго прагаласавала большасць членаў журы Конкурсу.

## 5. УДЗЕЛЬНІКІ КОНКУРСУ І ЎМОВЫ ЎДЗЕЛУ

5.1. У Конкурсе могуць удзельнічаць навучэнцы Беларусі і Кітая ад 15 да 18 гадоў.
5.2. Для ўдзелу ў Конкурсе неабходна падаць заяўку па ўстаноўленай форме (Дадатак) і накіраваць разам з ёй праект на электронны адрас: olimp@adu.by.
5.3. Сваёй заяўкай удзельнік пацвярджае сваё аўтарства і згоду з умовамі правядзення Конкурсу. Заяўка, афармленая не па форме, разглядацца не будзе.
5.4. Удзельнік Конкурсу рыхтуе праект на адну з прапанаваных тэм па выбары:
*для кітайскіх удзельнікаў*:

«Што я ведаю пра Беларусь?»;
«Чаму я хачу вывучаць беларускую мову?»;
«Чаму я хацеў бы / хацела б вучыцца ў Беларусі і дзе?»;

«Мая будучая прафесія»;

«Мае беларускія сябры»;

*для беларускіх удзельнікаў*:

«Што я ведаю пра Кітай?»;

«Чаму важна ведаць кітайскую мову?»;

«У якой навучальнай установе нашай краіны я хацеў бы / хацела б вучыцца?»;

«Мая будучая прафесія»;

«Мае кітайскія сябры»;

Творчая работа павінна ўтрымліваць кароткія звесткі пра сябе (фатаграфія (па жаданні), узрост, краіна пражывання, сфера інтарэсаў і інш.).

5.5. Форма прадстаўлення праекта можа быць любой (буктрэйлер, фотазамалёўка, прэзентацыя, сачыненне, нарыс, эсэ і г.д.).

5.6. Тэхнічныя патрабаванні да праектаў:

- набор тэксту пісьмовай работы ажыццяўляецца з выкарыстаннем тэкставага рэдактара Word; рэкамендуецца выкарыстоўваць шрыфты тыпу Times New Roman памерам 14 пунктоў; міжрадковы інтэрвал – адзінарны; устанаўліваюцца наступныя памеры палёў: верхняга і ніжняга – 20 мм, левага – 30 мм, правага – 10 мм; шрыфт друку павінен быць прамым, светлага контуру, выразным, чорнага колеру, аднолькавым па ўсім аб’ёме тэксту; аб’ём пісьмовай работы не павінен перавышаць 6 старонак;
- у фармаце відэароліка: працягласць – не больш за 5 хвілін; максімальнае разрозненне відэа – 1280х720 пікселяў; дапушчальныя фарматы відэафайла – AVI, DivX, MPEG, WMV, MP4; максімальны аб’ём гатовага файла – не большы за 50 Мб;
- у фармаце фатаграфій: фармат файла: JPEG, PNG; максімальны памер па шырокім баку – 2500 пікселяў; максімальнае разрозненне – 150 dpi; дапушчальны аб’ём кожнай фатаграфіі – не большы за 8 Мб;
- у фармаце прэзентацый: файлы з пашырэннем PPT, PPS, PPTX, PPSX, PDF; максімальны аб’ём – не большы за 10 Мб; максімальная колькасць слайдаў у прэзентацыі – не большая за 15.

5.7. Да ўдзелу ў Конкурсе не дапускаюцца работы, якія не адпавядаюць акрэсленым вышэй патрабаванням.

## 6. ПАРАДАК АРГАНІЗАЦЫІ І ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

6.1. Конкурс праводзіцца з 17 чэрвеня па 14 кастрычніка 2019 года.

6.2. Асноўнымі крытэрыямі ацэнкі праектаў з’яўляюцца:

- адпаведнасць тэме, мэце, задачам Конкурсу;

- змястоўны бок (паўната адлюстравання інфармацыі, вызначанай у п. 5.4 дадзенага палажэння);
- адпаведнасць тэхнічным патрабаванням, вызначанным у п. 5.6 дадзенага палажэння;
- арыгінальнасць праекта;
- ступень эмацыйнага ўздзеяння.

## 7. ПАДВЯДЗЕННЕ ВЫНІКАЎ І ЎЗНАГАРОДЖАННЕ

7.1. Пераможцы Конкурсу вызначаюцца большасцю галасоў членаў журы.

7.2. Паведамленне пра час і месца правядзення цырымоніі ўзнагароджання ўдзельнікаў Конкурсу ажыццяўляе Аргкамітэт.

7.3. Фінансавыя выдаткі, звязаныя з узнагароджаннем удзельнікаў Конкурсу, нясе арганізатар, іншыя арганізацыі і ўстановы, згодныя аказаць дапамогу.

ДАДАТАК

Заяўка
на ўдзел у Міжнародным конкурсе праектаў
«Беларусь і Кітай: Мост у будучыню»

| | |
|---|---|
| Прозвішча, імя, імя па бацьку | |
| Дата нараджэння | |
| Дамашні адрас | |
| Кантактны тэлефон | |
| Электронная пошта | |
| Назва праекта | |
| Форма прэзентацыі праекта | |